тое, што атрымалі на занятках па акцёрскаму майстэрству, сцэнічнай мове, руху, пластыцы. Яны расказваюць, як гэтыя, на першы погляд, не вельмі сур'ёзныя веды дапамагаюць ім у жыцці. І амаль усе, хто падрастае ў школьных калектывах-спадарожніках прыходзяць потым у нашы тэатры: народны тэатр драмы і камедыі і ўзорны юнацкі тэатр "Балаганчык", які нарадзіўся пры ГДК таксама зусім нядаўна.

І яшчэ адна асаблівасць нашага тэатральнага гарадскога мастацтва. Гэта — сямейныя дынастыі. Я думаю, амаль кожны з маіх калег можа сказаць тое ж самае. У нашым тэатры за некалькі год стварыліся тры новыя сям'і. Дзеці старэйшых удзельнікаў прыходзілі ўслед за імі, знаёміліся, кахаліся і гулялі цудоўныя тэатральныя вяселлі. А гэта значыць, што будуць новыя акцёры, новыя спектаклі на радасць сабе і людзям.

*І. А. Алексіна,*
*аспірантка кафедры тэатральнай творчасці Беларускага універсітэта культуры*

## Падрыхтоўка рэжысёраў народных тэатраў: традыцыі і перспектыўныя напрамкі

Кардынальнай, першачарговай задачай, ад паспяховасці вырашэння якой залежыць воблік тэатральнага мастацтва ў XXI ст., застаецца падрыхтоўка высокакваліфікаваных кадраў.

Праблема падрыхтоўкі сучаснага рэжысёра для працы ў галіне прафесійнага мастацтва атрымала дастаткова шырокі рэзананс. Пытанні выхавання і адукацыі спецыялістаў у галіне тэатральнай аматарскай творчасці, асабліва ў сувязі з патрабаваннямі сучаснасці, пакуль што застаюцца па-за ўвагай. Менавіта гэты аспект і стане галоўнай тэмай нашай сённешней гаворкі.

Падрыхтоўку рэжысёраў як прафесійнага, так і аматарскага тэатра, мэтазгодна распачынаць з дзіцячых год: у драмгуртках, спецкурсах у школах, каледжах, гімназіях, калектывах-спадарожніках народных тэатраў. Гэта тэма вельмі важная і заслугоўвае асобнай гаворкі. Мы ж спынімся на вышэйшай ступені лесвіцы падрыхтоўкі прафесіяналаў, скіруем сваю ўвагу на сферу вышэйшай адукацыі.

Прыярытэт у падрыхтоўцы спецыялістаў для працы ў народных аматарскіх тэатрах краіны, належыць двум вышэйшым установам — Тэатральна-мастацкаму інстытуту (сучаснай Акадэміі мастацтваў) і Інстытуту культуры (сучаснаму Універсітэту).

Агульная колькасць выпускнікоў для кіравання народнымі тэатрамі краіны і самадзейнымі драмгурткамі, падрыхтаваных Тэатральна-мастацкім інстытутам пад кіраўніцтвам вядомых дзеячаў беларускага мастацтва У. А. Маланкіна, Я. А. Громава, А. Х. Андросіка, за дваццацігадовы перыяд складае 87 чалавек. З моманту адкрыцця і па сённяшні дзень галоўнай навучальнай установай, якая папаўняе самадзейныя калектывы высокаадукаванымі спецыялістамі, ВНУ, у якой склаліся ўстойлівыя традыцыі і шматгадовая выкладчыцкая практыка, з'яўляецца

Беларускі універсітэт культуры, і ў дадзеным выпадку — кафедра тэатральнай творчасці.

На кафедры замацаваўся моцны выкладчыцкі склад. Кожны педагог — майстар сваёй справы, мае не толькі выдатную адукацыю, але і значную практыку ў выкладанні сваёй дысцыпліны, валодае неабходнымі псіхолага-педагагічнымі данымі для дыягностыкі і развіцця творчых здольнасцей і талентаў студэнтаў. Таму і атэстацыйная камісія ў 1996 г. адзначыла высокі і сур'ёзны ўзровень арганізацыі навучальнага працэсу на кафедры тэатральнай творчасці. Навучальная праграма па спецыяльнасці грунтуецца на спасціжэнні студэнтамі-рэжысёрамі лепшых здабыткаў сусветнай мастацкай культуры, якое лаканічна спалучаецца з творчай спадчынай майстроў нацыянальнай сцэны: І. Буйніцкага, Е. Міровіча, Ф. Ждановіча, У. Галубка і іншых. На сённешні дзень кафедра працуе ў больш шырокім напрамку, вядзецца мэтанакіраваная падрыхтоўка акцёраў і рэжысёраў для папаўнення штату абласных драматычных і лялечных тэатраў, адчынены эксперыментальны курс рэжысёраў фальклорных тэатраў.

Раней дзейнасць кафедры насіла больш акрэслены характар: рыхтавалі кіраўнікоў самадзейных драматычных калектываў. Згодна патрабаванням сучаснасці сёння ў дыпломе выпускніка значыцца — "Рэжысёр, арганізатар тэатральнай творчасці, выкладчык тэатральных дысцыплін". Ён дазваляе маладому спецыялісту весці педагагічна-выкладчыцкую дзейнасць, што дае больш магчымасцей у пошуку працоўнага месца на рынку працы. Аднак выпускнік кафедры не заўсёды бывае дастаткова падрыхтаваным маральна для спецыфічнай працы з аматарамі.

У свеце кардынальных дзяржаўных, палітычных, сацыяльных, эканамічных і культурных пераўтварэнняў, што адбываюцца ў нашым грамадстве на працягу апошняга дзесяцігоддзя, пад уплывам пераацэнкі мастацкіх каштоўнасцей і пераасэнсавання ролі, задач і функцый усёй мастацкай творчасці ў жыцці кожнага чалавека і нацый значна павышаецца планка прафесійных патрабаванняў да кіраўніка народнага тэатра. Тут выяўляе сябе не толькі спецыфіка работы з аматарамі. Пад уплывам навукова-тэхнічнага прагрэсу, пашырэння друку, кіна-, відэа-, тэлепрадукцыі значна ўзрос адукацыйны цэнз гледачоў, іх мастацкі густ і патрабавальнасць да прадукту тэатральнай вытворчасці, што выклікае неабходнасць стварэння высокапрафесійных, у мастацка-эстэтычным сэнсе, твораў.

Сучасны кіраўнік народнага тэатра павінен мець не толькі прыродныя дадзеныя і мастацкі талент, быць таленавітым арганізатарам і педагогам-выхавацелем артыста-аматара, валодаць майстэрствам мізансцэнавання, але ён абавязан яшчэ бесперапынна, мэтанакіравана працаваць над сабой, удасканаленнем сваёй асобы. Акрамя таго, у склаўшыхся эканамічных умовах кіраўнік народнага тэатра павінен валодаць пытаннямі маркетынгу і менеджменту. Прапанаваныя абставіны жыцця вымагаюць ад выпускніка кафедры тэатральнай творчасці сфарміраванага светапогляду, грамадскай сталасці і значнага жыццёвага і творчага вопыту.

Для выхавання творчай асобы пяці гадоў ва універсітэце мала. Кантэкст навучальнай праграмы гэтай ВНУ мае на ўвазе вялікую самастойную працу студэнта. Нягледзячы на дастаткова вялікі творчы конкурс на гэта аддзяленне, большасць студэнтаў складаюць учарашнія школьнікі. Гэта выклікае неабходнасць вывучэння значнай колькасці агульна-адукацыйных дысцыплін, чым аўтаматычна скарачаецца колькасць каштоўнейшых гадзін па спецыяльных дысцыплінах.

Таму, калі зрабіць сярэднюю спецыяльную адукацыю абавязковай умовай для ўдзелу ў творчым конкурсе на экзамене па спецыяльнасці, з'явіцца магчымасць павялічыць колькасць гадзін на спецпрадметах, прымаць на курс абітурыентаў, якія валодаюць першаасновамі прафесійных ведаў, больш вопытных і падрыхтаваных у творчым плане людзей. У гэтай сувязі мэтазгодным будзе ўдасканаліць навучальную праграму кафедры, каб ва універсітэце спалучаліся, замацоўваліся і паглыбляліся веды, атрыманыя ў вучылішчах мастацтваў, суаднесеныя з практычнай дзейнасцю. Тут паўстае пытанне актуальнасці актыўнага супрацоўніцтва вучылішча і універсітэта, распрацоўкі сумеснай адукацыйна-выхаваўчай праграмы. Усё гэта не толькі значна палегчыць працу педагогаў кафедры, зробіць навучальны працэс больш цікавым для студэнтаў, але і плённа паўплывае на ўзровень асэнсавання драматычных твораў, мастацкі ўзровень выкананых роляў і рэжысёрскіх работ, а, значыць, і мастацкі прафесіяналізм працы маладога спецыяліста.

Выказаныя думкі не з'яўляюцца вычарпальнымі. Падводзячы вынікі сказанаму, падкрэслю, што падрыхтоўка спецыялістаў і далейшага павышэння іх прафесіяналізму будзе больш рэзультатыўнай пры ўмовах шматступенчатасці, паслядоўнасці і бесперапыннасці адукацыі, акрэсленай мэтанакіраванасці і скаардынаванай дзейнасці розных сацыяльных і культурных інстытутаў і арганізацый.